# Нашыя заданьні

Нашымі заданьнямі ё заданьні Народу нашага. Яны вынікаюць із стану, у якім ё Народ наш. Бацькаўшчына наша паняволена й падзелена. Палавіна яе пад назовам „Радзкае Соцалістычнае Рэспублікі Беларускае“ („Беларускае Савецкае Соцалістычнае Рэспублікі“ — БССР) ё найжудасьнейшаю калёню расійскаю, якой сьвет дагэтуль ня бачыў. Другое палавіны вялізарная бальшыня прылучана беспасярэдня да Маскоўшчыны, а меншымі часьцямі яе падаравала Масква нашых суседзяў. Расійцы русыфікуюць Народ наш і мову ягоную, заразом вывозяць з нашае Бацькаўшчыны Вялікаліцьвіноў (Беларусаў) і прывозяць да яе Расійцаў. Праз гэта мы ніколі ня маем забывацца.

Затым нам канечне патрэбна праграма супрацьдзеяньня душэўнаму паняволеньню й русыфікацы нашых людзёў на землях вялікалітоўскіх СССР, так і жмудзізацы, палёнізацы й украінізацы прылучаных да Жмудзі, Польшчы, Украіны, а таксама супрацьдзеяньне асыміляцы маладога пакаленьня нашае эміграцы.

Другое, сумленныя й празорлівыя людзі вольнага й нявольнага сьвету падняліся, першае, запыніць пашырэньне камунізмы, а другое, вывальніць паняволеныя ёю народы. Мы маем быць дзейнымі сябрамі іхнымі.

Трэйцяе, нельга нам абыйсьціся без рупатлівае ўвагі да дачыненьняў нашых суседзяў да нас, ня толькі затым, што ў бальшыні іх ё часьць Народу нашага, але й затым, што супольна дзеіць спарней, чымся паасобку.

Да менаваных справаў уходзе й заданьне аднавіць [...] пашырэньне Нацанальнага назову нашага „Літва“ ў хорме „Вялікалітва“, „Вялікаліцьвіны“, што прычыніцца да супоўнага нацанальнага ўсьведамленьня нашых мае, як спабыцьцё яго (маскоўскаю забаронаю) было прычыніўшыся да згубы нацанальнага сьведам’я ў нашым народзе.